8. *Самусік, А. Ф.* Русіфікацыя сістэмы асветы на беларускіх землях у апошняй трэці XVIII – другой палове XIX ст. / А. Ф. Самусік // Гістарычны альманах. – Гродна-Беласток, 2008. – Т. 14. – С. 48–93.

9. *Самусік, А. Ф.* Становішча адукацыйнай справы на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў / А. Ф. Самусік // Весці БДПУ. – 2007. – Сер. 2. – № 3. – С. 3–7.

10. *Гурецкий, А. А.* Политика царизма в области образования в Белоруссии в конце XVIII – первой четверти XIX в. (1772–1825): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. А. Гурецкий; Бел. гос. пед. ун-т. – Минск, 1996. – 20 с.

11. *Кузняева, С. А.* Асвета на Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя: тэндэнцыі развіцця / С. А. Кузняева // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён: зб. арт. – Мінск: БДУ, 1992. – С. 92–102.

12. Сборник постановлений по Министерству Народного Просвещения: в 3 т. – СПб.: Тип. П. П. Сойкина, 1875–1876. – Т. 1. -- 1875. – 1006 с.

13. Полное собрание законов Российской империи: в 45 т. – 1-е изд. – СПб.: Тип. 2-го отд. собственной его имп. величества канцелярии, 1830. – Т. 22. – 1173 с.

14. Полное собрание законов Российской империи: в 55 т. – 2-е изд. – СПб.: Тип. 2-го отд. собственной его имп. величества канцелярии, 1867. – Т. 3. – 692 с.

**(Дата поступления: 15.06.2023).**

**УДК 398.34(476-22)»18/19»**

# ЗЕМЛЯРОБЧЫЯ ПРЫМЕТЫ І ЗАБАБОНЫ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Мяньчэня С. В.*
Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І. С. Лупіновіча НАН Беларусі;
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

*У артыкуле разглядаюцца сельскагаспадарчыя прыметы і забабоны, звязаныя з практычнай дзейнасцю ў галіне земляробства: абмежаваннем гаспадарчай дзейнасці, рэгламентацыяй пачатку і часу палявых работ, пасадкай і зборам ураджаю, абаронай ад прыродных з'яў, агародніцтвам. Вера ў розныя забабоны абмяжоўвала давер да навуковых ведаў і новых тэхналогій, аднак пераважная большасць прыметаў і забабонаў ужо ў пачатку XX ст. успрымалася насельніцтвам, як простая рэкамендацыя да дзеяння. Тэарэтычнай асновай даследавання з'яўляюцца этнаграфічныя матэрыялы А. Багдановіча, Дз. Булгакоўскага, М. Косіч, Ю. Крачкоўскага, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага і М. Янчука.*

*Ключавыя словы: сельская гаспадарка; народная культура; прыметы; земляробства; агародніцтва.*

# AGRICULTURAL OMENS AND SUPERSTITIONS OF THE BELARUSIAN VILLAGE OF THE SECOND HALF OF THE 19th – BEGINNING OF THE 20th CENTURY

*Mianchenya S. V.*
I. S. Lupinovich Belarus Agricultural Library of the NAS of Belarus;
Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Belarus

*The article is devoted to agricultural omens and superstitions related to practical activities in the field of agriculture: limitation of activity, regulation of the beginning of field work, planting and harvesting, protection from natural phenomena, gardening. Belief in various superstitions limited trust in scientific knowledge and new technologies, however, the vast majority of omens and superstitions at the beginning of the 20th century were perceived by the population as a simple recommendation for action.The theoretical basis of the research is the ethnographic materials of A. Bogdanovich, Dz. Bulgakouski, M. Kosich, Yu. Krachkouski, E. Romanov, M. Nikiforowski and M. Yanchuk.*

*Keywords: agriculture; folk culture; omens; farming; horticulture.*

Ва ўмовах мадэрнізацыйных працэсаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. адбывалася трансфармацыя беларускага грамадства і разбурэнне патрыярхальнага ладу жыцця, які рэгламентаваўся сістэмай вусных традыцый і забабонаў. Сельская гаспадарка як аснова эканамічнага ладу пераважнай колькасці насельніцтва Беларусі таксама адчувала на сабе іх уплыў. Па пры-

чыне шырокага спектру прыметаў і забабонаў у даным артыкуле разгледзім толькі тую іх частку, што звязана з практычнай дзейнасцю ў галіне земляробства, а менавіта – рэгламентацыя пачатку і часу палявых работ, пасадка і збор ураджаю, абарона ад прыродных з'яў, агародніцтва. Тэарэтычнай асновай даследавання з'яўляюцца этнаграфічныя матэрыялы А. Багдановіча [1], Дз. Булгакоўскага [2], М. Косіч [3], Ю. Крачкоўскага [4], Е. Раманава [5; 6], М. Нікіфароўскага [7] і М. Янчука [8]. Даты народных і царкоўных святаў артыкуле прыводзяцца па старым стылі.

Найбольш значным абмежаваннем гаспадарчай дзейнасці з'яўляліся царкоўныя святы. У выпадку працы ў полі на Вялікдзень, па народных павер'ях, можна было скамянець [9, с. 351]. М. Янчук па выніках падарожжа па Мінскай губерні ў сярэдзіне 80-х гг. XIX ст. паведамляў пра камень «Валы», што знаходзіўся каля в. Крынкі (суч. – Крынка, Асіповіцкі раён). Па мясцовым паданні, гэта быў скамянелы селянін з сахой і парай валоў, што паехаў араць у свята [8, с. 77]. Далейшы лёс гэтага валуна невядомы, у адрозненні ад іншых падобных аб'ектаў: Сцеберацкія каменныя валы (каля в. Сцеберакі Вілейскага раёна), група валуноў «Быкі» (каля в. Іканы Барысаўскага раёна), што захаваліся да нашага часу.

У шэраг дзён дзейнічалі абмежаванні на некаторыя віды працы. М. Косіч пазначала, што беларускія сяляне Чарнігаўскай губерні не аруць па пятніцах. Ні яна сама, ні сяляне абгрунтаванага тлумачэння гэтага звычая не прыводзяць: «ни намы йета заведзена, ни намы и кончицца». Мясцовыя праваслаўныя святары ўвогуле тлумачылі гэта магчымымі наступствамі навязвання ісламу з боку татар [3, с. 56]. Згодна з Е. Раманавым, сяляне не працавалі па пятніцах на конях ад Вялікадня да Юр'я, а таксама 28 кастрычніка – на дзень Параскевы Пятніцы [5, с. 60]. Такім чынам, пятнічныя абмежаванні можна патлумачыць рэшткамі культа апошняй. Патрабавалася прадставіць адпачынак коням і ў наступныя дні: дзень св. Аўласа – 11 лютага [1, с. 98]; «Конскі Вялікдзень» – першы аўторак пасля Тройцы, не выкарыстоўвалі коней для працы, а ў хлявах ставілі свечкі за іх здароўе [2, с. 180]; 18 жніўня – дзень св. Флёра і Лаўра («Конскае свята»), у гэты дзень забаранялася не толькі працаваць на конях, але і нават спутваць ім ногі [5, с. 276]. Нельга было араць і вывозіць гной у поле на Дабравешчанне – «закону няма» [5, с. 143].

На Гродзеншчыне імкнуліся не працаваць на дзень прарока Іллі (20 ліпеня) – каб не наклікаць маланку. Калі хто-небудзь звозіў снапы з поля, то пакідаў іх у двары. Забаранялася звозіць снапы і на дзень Барыса і Глеба (24 ліпеня) – каб маланка не спаліла пуню [6, с. 39–40]. У Магілёўскай губерні на Барыса і Глеба забаранялася касіць і жаць, а ў Віцебскай – любая праца на конях [5, с. 273–274]. М. Нікіфароўскі прыводзіць прыказку: «На Барыса за серп і касу не бярыся!». Жняе, што будзе працаваць у гэты дзень, – выверне рукі, касец – парэжа ногі, а жывёла, калі з'есць сена, што было назапашана на Барыса, дасць выродлівы прыплод [7, с. 252]. Акрамя таго, св. Барыс разам са св. Мікалаем лічыўся ахоўнікам палеткаў, ён абыходзіў палі і забяспечваў добры ўраджай, таму пры разворванні загона трэба было аставіць шырокую



мяжу, каб Барыс мог там прайсці [7, с. 102]. У Ігуменскім павеце падобныя функцыі прыпісвалі св. Юр'ю [1, с. 109].

Пэўных рытуалаў патрабавала і падрыхтоўка да гаспадарчых работ. Адказна падыходзілі да вырабу сахі як асноўнай прылады для апрацоўкі глебы. Элементы сахі трэба рабіць з розных дрэў, на выпадак, калі адно з іх будзе нешчаслівым, то іншае ўраўнаважыць [7, с. 102]. Пераважная колькасць прымет, што звязаны з палявымі работамі, датычыліся мужчын. Жанчына фігуравала тут рэдка, найчасцей яе ўмяшальніцтва магло прывесці да негатыўных наступстваў. У Навагрудскім павеце існаваў звычай «развязаць саху». На Дабравешчанне гаспадыня павінна ўстаць раней за гаспадара і развязаць вяроўку на сахе, каб палегчыць працу і павысіць яе прадукцыйнасць [4, с. 101]. А вось калі жанчына пераступіць праз хамут – цяжкасць працы каня і гаспадара падвоіцца [7, с. 79]. Дрэннай прыметай лічылася, калі жанчына пяройдзе дарогу перад аратым. Той павінны быў падняць з зямлі і кінуць у яе бок які-небудзь цвёрды прадмет, інакш зламаецца саха. Насошнікі мазалі салам, каб жывёла не муліла шыю, гаспадар – рукі, а на полі не рос асот [7, с. 104]. Насенне імкнуліся нікому не пазычаць ці прадаваць, бо інакш будзе кепскі ўраджай. Калі ўсё ж такі гэта здаралася, найчасцей з бульбай, то з адсыпанай на продаж часткі забіралі некалькі бульбін і кідалі назад [4, с. 73]. Вываз гною на поле ажыццяўлялі ў «поўныя» дні – пры павялічваючымся месяцы, інакш ён страціць эфект угнаення і будзе спрыяць росту зелля. Жанчыны дапускуліся толькі да раскідвання гною па полю і толькі ў надзвычайных выпадках [7, с. 101].

За некалькі дзён да пачатку палявых работ гаспадар рабіў «провідкі» – ішоў на поле з хлебам-соллю і абыходзіў яго з вярбовым дубцом [7, с. 102]. У Вілейскім павеце валоў асвячалі святой вадой – гаспадыня ў хляве, а гаспадар на полі [4, с. 92]. Пачыналі араць звычайна ў аўторак ці чацвер, часам у суботу [5, с. 179; 7, с. 109]. На Віцебшчыне ў сувязі з пачаткам палявых работ узгадваўся звычай «набіць цесця і цешчу». Выпраўляючыся ў поле, гаспадар павінен быў у жартаўлівай форме імітаваць удары па бацьках жонкі. Аб'ект «біцця» залежыў ад часу палявых работ і сельскагаспадарчай культуры. Калі б'юць цесця – будзе добры ўраджай азімых, часцей жыта; цешчу – яравых, часцей пшаніцы [7, с. 103].

У Кобрынскім павеце некаторыя гаспадары рабілі «заворванне» – вечарам ехалі на поле і рабілі дзве-тры баразны. Важна пры гэтым было не сустрэць каго-небудзь з пустой тарай, і каб ніхто не перайшоў дарогу. У той жа час гаспадыня прыбірала хату. Лічылася, што калі ў хаце будзе чысціня, тады і на полі не будзе зелля [4, с. 92]. Пінчукі ў поле бралі з сабой грамнічную свечку, прасфору і бохан хлеба. У першы дзень разворвалі толькі адзін загон. Пасля першай баразны араты падбягаў да каня ці вала, біў яму па ільбу і жадаў здароўя [2, с. 185].

Праца ў полі лічылася паважанай, перашкодзіць ёй было грахом. Калі нехта скрадзе з поля саху ці якую іншую прыладу, у таго здохнуць валы і сем год не будзе радзіць жывёла, а напрыканцы злодзея самога чакалі хвароба і смерць [8, с. 78].

Калі для апрацоўкі зямлі пятніца не лічылася вельмі прыдатным днём, то для пачатку сяўбы наадварот. На сяўбу выпраўляліся звычайна ў пятніцу, першы загон засейвалі жытам, а зерне бралі з вянка, што захоўваўся ад Дажынак. Напрыканцы вянок закопвалі на краю поля [2, с. 185]. На Краснапольшчыне пачатак сяўбы – «засеўкі» – ажыццяўлялі хлопчыкі 10–14 гадоў, абавязкова ў святочным адзенні і на пусты страўнік. У дзень сяўбы гаспадар не павінны быў запальваць агонь, бо выгараць пасевы [4, с. 94]. Нельга было сеяць, калі ў вёсцы быў нябожчык, а таксама падчас царкоўнага звону [7, с. 107].

Збожжавыя, што сеялі пры маладзіку, давалі тонкую салому і пустыя каласы. Найлепшы ўраджай жыта чакалі ад зерня, пасеянага ў аўторак і суботу, а вось каб атрымаць добрую пшаніцу і муку, гаспадар павінны быў сеяць ноччу і абавязкова голы [7, с. 105, 108].

На 21 мая – Аленін дзень – сеялі лён, з-за сугучнасці назваў гэты дзень лічыўся найбольш прыдатным, асабліва ўдалы ўраджай чакалі, калі гэты дзень выпадаў на панядзелак [5, с. 190]. Удалым лічыўся і вечар напярэдадні Юр'ева дня – лён будзе высокі. Сеяць лён трэба было моўчкі [4, с. 94], у чыстым адзенні і не з сявенькі, а з фартуха светлага колеру [7, с. 110]. Для лепшага ўраджая разам з насеннем клалі вараныя яйкі. На полі іх падкідвалі ўгору, каб лён быў высокі і «галавасты», затым яйкі трэба было з'есці абавязкова стоячы [5, с. 190; 7, с. 110].

Грачыху імкнуліся садзіць 12 чэрвеня – у дзень св. Ануфрыя і 13 чэрвеня – на «Акуліну-грачышніцу» [7, с. 207]. Пажадана было сеяць у воблачны дзень і, як у выпадку з ільном, з фартуха, але цёмнага колеру, які адпавядаў спеламу стану культуры [7, с. 108].

Гарох сеялі у той дзень тыдня, у які зімой пайшоў першы снег [5, с. 280]. Умовамі добрага ўраджаю гароха былі паўднёвы вецер і наяўнасць побач з полем дзяцей. Увогуле дзецям не забаранялася лазіць у чужы гарох, галоўная ўмова – есці на месцы і нічога не забіраць з сабой. Чым часцей дзеці наведвалі гароховае поле, тым большы ўраджай з яго чакалі, аднак гэтае правіла не дзейнічала, калі першай трапляла ў гарох дзяўчынка. Калі ж гаспадар спаймаў у сваім гаросе дзяцей і пабіў іх – трэба было чакаць, што ўраджай з'ядуць чэрві [7, с. 109].

Бульбу нельга было саджаць паміж праваслаўным і каталіцкім Юр'ем. Калі, едучы саджаць бульбу, пабачыць сядзячага чалавека, а яшчэ горш накрытага чымсці, як робяць пастухі, то лепш вяртацца дадому [7, с. 126]. Прыкметай добрага ўраджаю лічыліся «грудаватыя» аблокі на небе. Каб бульба не згніла ці не папяклася ў зямлі, забаранялася гатаваць яе на вогнішчы падчас пасадкі [4, с. 66, 68].

Адначасовая апрацоўка глебы на сумежных палях і асабліва сяўба лічыліся непажаданай з'явай, бо яны прыводзілі да змяншэння ўраджайнасці. На Віцебшчыне лічылася, што дрэнны будзе ў абодвух суседзяў, а вось на Гродзеншчыне – што «другасны» ўраджай атрымае той, хто пачне пазней [7, с. 105; 6, с. 73]. У Бельскім павеце лічылася, што без пагрозы страты ўраджая



пачынаць працу на суседнім полі можна толькі праз два дні. У 80-я гады XIX ст. спрэчка аб чарговасці давяла да судовага разбіральніцтва, аднак суд загадаў суседзям замірыцца [6, с. 73]. Існаваў і такі варыянт, што ваш ураджай дастанецца суседу, які яшчэ не пачынаў працы, калі той сустрэне вас, калі вы вяртаецеся з поля, скончыўшы працу [7, с. 106]. Шэраг прыметаў і забабонаў вызначалі, як пазбавіцца негатыўных наступстваў ад гэтага, аднак варыянт заключэння дамоўленасці з суседзямі датычыўся толькі пасеву азімых. Чарга вызначалася наступным чынам: гаспадары варылі яйкі і збіраліся разам, звычайна каля карчмы. Пасля яйкі білі, і той, у каго яйка было без пустаты, атрымліваў права сеяць першым [5, с. 276]. У Бельскім павеце пачынаць палявыя работы павінны былі заможныя гаспадары – тады і ўраджай для ўсёй вёскі будзе багатым, а калі нехта з бедных першым выходзіў у поле, аднавяскоўцы сварыліся і маглі нават пабіць яго [6, с. 73]. Калі чарговасць вызначыць было немагчыма, патрабавалася выкананне наступных правілаў. У выпадку, калі два аратых прыехалі на поле адначасова, трэба было працаваць сінхронна. Сінхронны пасеў мог прынесці карысць абодвум толькі тады, калі сейбіты падчас працы аддаляліся адзін ад аднога [7, с. 104]. Тым не менш некаторыя гаспадары, каб павялічыць ураджай, таемна назіралі за суседам-сейбітам і, калі ён кідаў апошнюю жменю, беглі сеяць [7, с. 106].

Неякасная праца сейбіта – утварэнне пустак на засеяным полі – была прыкметай таго, што ў гаспадарцы хто-небудзь памрэ. Трава, што вырастала на такіх месцах, мела чароўную моц і дапамагала пры пажарах. Яе «смяротны» пачатак дапамагаў «забіць» агонь – абышоўшы будынак, ахоплены агнём тры разы, трэба было кінуць траву ў вогнішча [7, с. 106]. У Слонімскім павеце прадвеснікам смерці блізкіх лічылася дрэннае прарастанне канопель [4, с. 95].

Дагляд за ўраджаем датычыўся абароны ад прыродных з'яў і магічнага ўздзеяння. Найбольш архаічным рытуалам па абароне ад засухі было абворванне вёскі, што ўжывалася таксама на выпадак эпідэмій. Месцамі абворванне ад засухі патрабавала выканання наступных умоў, звязаных з верай у звышнатуральныя магчымасці блізнятаў. Саха, якой рабілі абворванне, павінна была быць зроблена блізнятамі, араты – быць адным з блізнятаў, валы – таксама блізняты [4, с. 196]. Існавалі і больш простыя спосабы, што не патрабавалі калектыўнага ўмяшальніцтва. На Віцебшчыне, каб пазбавіцца ад засухі, раілі павесіць на двары жывую мядзведку. Калі на мясцовых могілках быў пахаваны тапелец, яго імкнуліся залагодзіць, каб ён «вярнуў ваду», і ставілі на магілу пасудзіну з вадой [7, с. 216]. Для абароны палеткаў ад граду і ветру на полі закопвалі рэшткі Вялікодных страў [5, с. 156]. З гэтай жа нагоды на канцах поля забівалі ў зямлю асінавыя калы [4, с. 135]. Разавай дапамогай ад граду ў Беластокскім павеце лічыўся вынас на двор лапаты для хлеба і Вялікоднага абруса [6, с. 64].

Неслі пагрозу ўраджаю таксама ведзьмакі і ведзьмы. Першыя лічыліся больш моцнымі, але другія мелі больш магчымасцей скрасці ўраджай і нанесці шкоду гаспадару. У розных рэгіёнах Беларусі было пашырана павер'е

аб заломах і «абжатых загонах». Залом, ці закруцень, уяўляў сабой загнуты ці звязаны адмысловым чынам пучок калоссяў. Заломы рабіліся для таго, каб нашкодзіць гаспадару, і неслі розныя непрыемнасці – ад хваробы да смерці. Заломы маглі рабіць і ведзьмы, і ведзьмакі. Ведзьмін залом не меў вялікай сілы, вядзьмак мог з лёгкасцю вырваць яго [5, с. 264]. Вырваць залом можна было і святару пасля адмысловай малітвы [4, с. 142]. На словах Е. Раманава, «более развитые хозяева» ліквідавалі заломы самі: спачатку абжыналі месца залома, а потым спальвалі яго [5, с. 264]. А. Багдановіч адзначаў, што калі хтосьці з інтэлігенцыі вырываў залом, каб паказаць яго бясшкоднасць, сяляне казалі, што залом толькі адукаваным не пагражае, бо яны самі чараўнікі [1, с. 170]. «Абжатыя загоны» – некалькі зрэзаных калоссяў, што падчас красавання жыта зразаюць ведзьмакі, ці ведзьмы. Гэта дапамагала ім атрымаць сотую частку ўраджая з абжатага палетка [4, с. 143]. Ведзьмы маглі скрасці ўраджай у Купальскую ноч. Для гэтага яны голыя з распушчанымі валасамі абыходзілі чужыя палі. Каб абараніцца ад іх, у Вілейскім павеце на Купалле дзяўчыны ўтыркалі па вуглах поля галінкі, а ў в. Ляўковічы Быхаўскага павета мужчыны начавалі ў полі [4, с. 135; 5, с. 210].

Лепшымі днямі для пачатку жніва лічыліся аўторак, чацвер, субота. Пачатак жніва ў пятніцу быў гарантыяй таго, што зерне не будуць есці мышы, але вось іншыя якасці будучага ўраджая будуць нізкія. Перад жнівом у хаце мылі лавы, засцілалі абрусам стол. Як і ў выпадку пасадкі бульбы, дрэннай прыкметай лічылася сустрэць каго-небудзь па дарозе на поле, у такім выпадку рэкамендавалася лепш вярнуцца дадому [7, с. 110–111]. Жаць пачыналі левай рукой, тады не будзе балець галава, каб не балела спіна – трэба было падпаясацца каласамі. Негатыўна ацэньвалася і чужое ўмяшальніцтва ў працу. Калі хто пяройдзе загон – жняя парэжацца, калі пераступіць праз серп – будзе рэзаць рукі, пакуль серп не адрамантуюць [7, с. 112, 113].

Для лепшага захоўвання ўраджая збожжа першы воз са снапамі везлі дадому вечарам таго дня тыдня, калі было Дабравешчанне [5, с. 116]. Першы воз з поля перавозілі праз Велікодны абрус, затым абрус вешалі у гумне да таго часу, пакуль не завершыцца абмалот [5, с. 263, 297]. Гэтыя маніпуляцыі павінны былі абараніць ад мышэй. Каб мышы не паелі хлеб, каля гумна забаранялася есці, а падчас пераносу першага снапа – размаўляць [6, с. 66].

Калі палявыя работы былі пераважна мужчынскай справай і ўмяшальніцтва ў яе жанчыны дапушчалася ў крайнім выпадку, то агародніцтва было ўдзелам жанчын. У прыметах, звязаных з ім, мужчыны не ўзгадваюцца. Цікавым фактам з'яўляецца звычай падрыхтоўкі насення. За некалькі дзён да пасадкі насенне розных культур (морквы, агуркоў, капусты, рэдзькі) клалі ў бурак, у якога выймалі сярэдзіну, затыкалі і змяшчалі ў кубел. Тады бурак, расліна якую не ядуць чэрві, перадавала насенню свой «сакрэт» [7, с. 122].

На Піншчыне працы ў агародзе было прысвечана 8 мая – «Доўгі Іван». У гэты дзень саджалі моркву, агуркі, рэдзьку. Пры гэтым жанчыны высока задзіралі спадніцы, каб пасаджанае высока ўзыйшло і хапаліся за калені – каб



вырасла такое ж тоўстае і круглае [2, с. 179]. У Гродзенскай губерні імкнуліся садзіць моркву ў абутку, інакш стрыжань будзе мець некалькі частак (як пальцы на назе). Каб цыбуля была горкая, яе садзілі ў постныя дні – сераду і пятніцу, каб салодкая – у іншыя [4, с. 96]. А вось на Віцебшчыне горкі смак цыбулі прыпісвалі кепскаму настрою гаспадыні [7, с. 123]. Агуркі трэба было садзіць у дзень, калі на небе былі аблокі, тады і агуркі будуць кучамі ляжаць на градзе [4, с. 96]. На Віцебшчыне лічылася, што лепшы час для пасадкі – калі статак выганяць у поле, а ў Рагачоўскім павеце – вечарам [7, с. 124; 5, с. 299]. Калі агуркі пачыналі квітнець, на граду кідалі стары лапаць ці яшчэ што-небудзь плеценае, лічылася, што тады агуркі будуць лепш плесціся. Для паляпшэння ўраджаю трэба знасці зросшыўся агурок, замачыць яго вадой і выкарыстоўваць гэтую ваду для паліванняў [5, с. 297].

Значная колькасць прыметаў была звязана з капустай. На Краснапольшчыне жанчыны, калі садзілі капусту, апраналі ірваную кашулю і зачэсвалі галавы, каб капуста была ліставая і цвёрдая. У Слонімскім павеце, каб капуста ўрадзілася, клалі на граду бохан хлеба [4, с. 95]. На Віцебшчыне падчас пасадкі капусты рукі вымазвалі свянцоным салам, каб чэрві не елі. Калі саджалі першае каліва, трэба было ўзяцца за галаву, каб капуста ўрадзілася. Каб капуста не вырасла зморшчанай, забаранялася смяяцца [7, с. 125]. Для абароны капусты ад чарвей дзяўчыны раскідвалі над градой рэшткі русальнага вянка, у якім адзначалі Русальны тыдзень. З гэтай жа нагоды ў граду забівалі драўляны калок [5, с. 207, 298].

Прыметы і забабоны рэламентавалі ўвесь спектр землярobчых работ і з'яўляліся вынікам своеасаблівага спалучэння язычніцкага і хрысціянскага светапогляду. Яны вызначалі тэрмін працы і яе чарговасць, умовы атрымання добрага ўраджаю і адлюстроўвалі традыцыйныя народныя сельскагаспадарчыя веды. Самі па сабе прыметы шкоды гаспадарцы не неслі, аднак іх непахіснае выкананне і вера ў розныя забабоны абмяжоўвалі давер да навуковых ведаў і новых тэхналогій, што ўжо мела канкрэтныя матэрыяльныя наступствы. Разам з гэтым, пераважная большасць прыметаў і забабонаў ужо ў пачатку XX ст. успрымалася насельніцтвам, асабліва моладдзю, калі не як архаізм, то як простая рэкамендацыя да дзеяння.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов: этнографический очерк / А. Е. Богданович. – [Репринтное изд.]. – Минск: Беларусь, 1995. – [3], III, 186 с.

2. *Булгаковский, Д. Г.* Пинчуки. Этнографический сборник: песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь / Д. Г. Булгаковский // Записки Императорского Русского географического общества по отделению этнографии. – Т. XIII. – Вып. 3. – СПб., 1890. – 200 с.

3. *Косич, М. Н.* Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни / М. Н. Косич. – СПб.: тип. кн. В. П. Мещерского, 1902. – [2], 128, 23 с.; 25.

4. *Крачковский, Ю. Ф.* Быт западнорусского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – М.: Университетская типография. – 1874. – 212 с.

5. *Романов, Е. Р.* Быт белорусса. Словарь условных языков // Белорусский сборник. Выпуски восьмой и девятый. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1912. – 600, 126 с.

6. Материалы по этнографии Гродненской губернии. Выпуск 1. По поручению Виленского учебного округа редактировал Е. Романов. Издание Управления Виленского учебного округа. – Вильно, 1911. – 238 с.

7. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах местах ... Витебской Белоруссии. – Витебск: Губернская Типолитография, 1897. – 307 с.

8. *Янчук, Н. А.* По Минской губернии, заметки из поездки в 1886 г. / Н. А. Янчук // Труды этнографического отдела Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии при Московском университете. Кн. IX. Сборник сведений для изучения быта крестьянского населения России. – Вып. 1. – 1889. – С. 57–112.

9. Белорусское Полесье // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном экономическом и бытовом значении / под ред. П. П. Семенова. – СПб. – М., 1882. – Т. 3. – Ч. 2. – 490 с.

**(Дата поступления: 15.06.2023).**

# ТРЕБОВАНИЯ К СТАТЬЯМ В СБОРНИКЕ НАУЧНЫХ ТРУДОВ «“ДОЛГИЙ XIX ВЕК” В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ»

Язык изложения материала публикации – русский или белорусский, текст должен соответствовать критериям научности, правилам грамматики и орфографии.

Объем статьи – до 40 000 знаков, текстовый редактор – Microsoft Word.

Статья должна включать следующие элементы:

- обязательно код УДК;
- название статьи на русском (белорусском) и английском языках;
- фамилия, имя и отчество автора полностью на русском (белорусском) и английском языках;
- место работы (название организации в соответствии с уставными документами) и должность на русском (белорусском) и английском языках;
- аннотация до 1000 знаков на русском (белорусском) и английском языках;
- ключевые слова на русском (белорусском) и английском языках, отделяются друг от друга точкой с запятой;
- список использованных источников, порядковые номера ссылок на источники в тексте приводятся внутри квадратных скобок [1, с. 23; 2, л. 10]. Список источников дублируется в транслитерации;
- дата поступления статьи в редакцию, подпись автора.

Текст статьи подается на бумажном или электронном носителе. Электронный вариант подается в формате xxxxxx.doc (название файла – фамилия автора).

Подача статьи рассматривается как согласие автора на ее размещение в электронных библиотеках. Автор заключает лицензионный договор с РИВШ на право использования научного произведения в данном сборнике.

Для аспирантов (doctoral candidate) обязательна рецензия научного руководителя или рекомендация кафедры.

Авторы несут ответственность за содержание предоставленных в статьях материалов, гарантируют, что они публикуются впервые и являются оригинальными.

Статьи, не соответствующие предъявляемым требованиям, с многочисленными орфографическими, грамматическими ошибками могут быть отклонены на любом этапе формирования сборника. Рукописи, не прошедшие рецензирование, не возвращаются и не обсуждаются.

Статью подавать лично по адресу: г. Минск, ул. Московская, 15, к. 729 либо на e-mail: LongXIXcnt@mail.ru.